– пле′чики — вешалка: *//пов’е'с’ пла'т’јь* ***на пл’е'ч’ик’и****, а то памн’о'цъ//*;

– поро′жки — ступеньки: *//****паро'шк’и*** *у н’иво' до'ма плах’и'и, шыро'к’ии сл’и'шкъм//*;

– сварга′нить — приготовить: *//****сварɣа'н’*** *штъ-н’ибу'т’ на у'жын//*;

– тигули′ — отдалённый район, глушь, место, куда сложно добраться: *//э'тъ у'жъс как’и'јь* ***т’иɣул’и'****, је'хъл’и-је'хъл’и, је'л’ъ даје'хъл’и//.*

**Заключение.** Изучение региолекта определенной местности важно, так как оно помогает дополнить картину регионального своеобразия языка. Понятие региолекта является новым в современной науке о языке, поэтому наличие проблем, которые связаны с разграничением региолекта и диалекта, региолекта и просторечия, — это явление, требующее особого внимания лингвистов.

Наше исследование показало, что регионализмы широко представлены в речи жителей города Воронежа. Они присутствуют в речи воронежцев всех возрастов, но наиболее частотны у людей в возрасте около 40—50 лет. Из выявленных групп регионализмов самыми многочисленными являются лексические и морфологические, значительную часть также составляют фонетические.

**Список цитируемых источников**

1. *Трубинский, В. И.* Современные русские региолекты: приметы становления / В. И. Трубинский // Псковские говоры и их окружение : межвуз. сб. науч. тр. — Псков : Псков. гос. пед. ин-т, 1991. — С. 156—162.

2. *Герд, А. С.* Введение в этнолингвистику: курс лекций и хрестоматия / А. С. Герд. — СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2001. — 488 с.

3. *Ерофеева, Е. В.* Вероятностные структуры идиомов: социолингвистический аспект / Е. В. Ерофеева. — Пермь : Изд-во Перм. ун-та, 2005. — 320 с.

4. *Жеребило, Т. В.* Словарь лингвистических терминов / Т. В. Жеребило. — Изд. 5-е, испр. и доп. — Назрань : Пилигрим, 2010. — 486 с.

5. *Зварыкина, И. С.* К вопросу о соотношении диалектного и регионального в русском языке (на примере лексики Астраханского края) / И. С. Зварыкина // Гуманитарные исследования. — Астрахань : Астрах. ун-т, 2013. — № 2 (46). — С. 30—36.

УДК 821.161.3:808.5

**К. А. Губко**

*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ВОДАРЫ І ПАХІ ЯК З’ЯВА КУЛЬТУРЫ

**Уводзіны.** Чалавечае існаванне непарыўна звязана з адчуваннем, распазнаваннем і ўспрыманнем разнастайных водараў і пахаў. Аднак яны не толькі з’яўляюцца адной з нітак, што звязваюць чалавека з прыродай, а і пазначаюць мяжу, якая аддзяляе яго ад прыроды; з’яўляюцца элементам асяроддзя, дзе адбываецца станаўленне чалавека як суб’екта сацыяльнасці і культуры, сродкам асэнсавання важных дэталяў жыцця, яго адметнай часткай. Чалавецтва вывучае пахі на працягу амаль 2 500 гадоў. Пранікнуць у свет пахаў спрабавалі прадстаўнікі самых розных галін чалавечых ведаў: Платон, Арыстоцель, Лукрэцый, Дж. Лок, Р. Дэкарт, І. Кант, З. Фрэйд, Ж. П. Сартр і інш. [2, с. 10].

**Асноўная частка.** Пахі, водары маюць у жыцці чалавека вельмі важнае значэнне. Хоць органы нюху нібыта адыгрываюць другасную ролю, усё ж, выкарыстоўваючы толькі зрок і слых, мы атрымліваем няпоўныя веды пра нейкі прадмет або з’яву. Перцэпцыя пахаў — той інструмент пазнання свету, які нельга недаацэньваць. З усіх мастацтваў, за выключэннем паркавага, а таксама абрадавасці, карнавальных дзействаў, тэатральных эксперыментаў, лічыць Е. Фарыно, толькі літаратура выкарыстоўвае пахі як паўнавартасны мастацкі матэрыял [4]. Разам з тым мы прымаем думку, выказаную В. У. Мамцавай, што на сённяшні дзень роля пахаў і ў штодзённых камунікатыўных працэсах, і ў мастацкай літаратуры застаецца недаацэненай, а гэта вызначае актуальнасць абранага намі даследчага напрамку.

Ужо ў антычнай культуры чалавек спрабуе, пакуль што наіўна і няўмела, звязваць пахі і сэнсы. У міфалагічнай форме пахі атаясамліваліся з дзейнасцю герояў і багоў. Агульны сэнс міфа складаўся ў вызначэнні пахаў як пачатку, асновы, а міфічнага героя — як актыўнага пераўтваральніка іх сэнсаў. У далейшым з фонавага значэння пахі былі вылучаны для асэнсавання разнастайных матываў дзейнасці чалавека. Як адзначае В. У. Мамцава, пісьменнік павінен апісаць тое, што ён адчуў праз успрыманне паху. Перадаючы сваю інфармацыю пра той або іншы пах, аўтар твора літаральна пераводзіць свае адчуванні, пачуцці, настрой у словы, а гэта розным пісьменнікам удаецца ў рознай ступені.

Адным з важнейшых мастацкіх сродкаў увасаблення пахаў служыць метафара. Устаноўлена, што метафарычныя абазначэнні сустракаюцца ў апісаннях пахаў у тры з паловай разы часцей, чым проста прыметнікі-азначэнні. Можна сказаць, што метафара для пісьменніка з’яўляецца асноўным інструментам перакладу з мовы адчуванняў на мову мастацкага твора.

© Губко К. А., 2019

У адрозненне ад многіх іншых праяў знешняга свету (карцін прыроды, вобразаў стыхіі, прадметна-рэчавых аб'ектаў), пахі амаль не валодаюць самастойнай выразнай семантыкай ці сімволікай. Прад'яўленне аўтарскай перцэпцыі пахаў у мастацкім творы найчасцей заснавана на суб'ектыўных асацыяцыях і аналогіях.

Паводле спецыяльных даследаванняў [3], найбольш запатрабаванымі асацыяцыямі з'яўляюцца тыя, што звязаны з: 1) сінтэзам адчування (халодны, цёплы) і смаку (салодкі, горкі); 2) колерам (цёмны, светлы, празрысты); 3) настроем (вясёлы, бадзёры, рамантычны); 4) мышцавымі адчуваннямі (цяжкі, лёгкі); 5) пачуццём часу (ранішні, дзённы, вячэрні, начны); 6) функцыянальнасцю (поклічны, зманлівы, фантазійны, магічны, утульны); 7) інтэнсіўнасцю (тонкі, рэзкі, дурманны); 8) эмацыйнасцю (пяшчотны, агрэсіўны, спакойны).

Часта пахі ў літаратурных тэкстах служаць дапаўненнем да апісанняў прыроды ці гарадскіх ландшафтаў. Аднак важную ролю адыгрывае духоўны кампанент нюхальнай перцэпцыі. Пахі пераадольваюць межы часу і прасторы, засланяючы сваёй інтэнсіўнасцю дыханне сённяшняга дня. У паху ёсць памяць. Прынята спасылацца, як на класічны прыклад, на раман М. Пруста «У пошуках страчанага часу». Аднак не меншае майстэрства выявілі і прадстаўнікі іншых літаратур. Цудоўна ведаў, як пахне яго радзіма, А. Міцкевіч. Да чытача паэмы «Пан Тадэвуш» даносіцца, у прыватнасці, цудоўны пах бігасу, што бурліць у катлах, асабліва адчувальны пасля палявання на мядзведзя, а таксама водар кавы, густой, як стары мёд, і чорнай, нібы вугаль… Працэс мастацкага выяўлення ўспамінаў праз пахі атрымаў назву «феномен Пруста» і стаў літаратурным топасам, крыніцай бясконцых індывідуальных варыяцый у самых розных аўтараў [1, с. 7]. Вельмі значную ролю адыгрываюць водары і пахі ў мастацкай рэалізацыі матыву кахання, у тым ліку ў спалучэнні з расліннымі вобразамі і ўстойлівымі сімваламі культуры. Яскравыя прыклады ў класічнай беларускай паэзіі — вершы П. Броўкі «Пахне чабор», П. Панчанкі «Белыя яблыні».

Аналіз твораў айчыннай літаратуры ў тыпалагічным параўнанні з асобнымі творамі прадстаўнікоў іншых літаратур мы вызначаем як перспектыву далейшай працы. У даследаванні мастацкай функцыі водараў і пахаў лічым мэтазгодным карыстацца паняццем «эманацыя». Гэта шматзначны міждысцыплінарны тэрмін, у аснове якога ляжыць метафарычны вобраз вытоку, што дае пачатак рацэ, але сам застаецца невычэрпным [5]. Можна сказаць, што пахі ў перцэпцыі літаратурных герояў — гэта эманацыя памяці.

**Заключэнне**. Водары і пахі, іх успрыманне, адносіны да іх, моўна-мастацкая інтэрпрэтацыя з'яўляюцца дынамічным культурным, гістарычным і сацыяльным феноменам. Важнае значэнне мае духоўны кампанент нюхальнай перцэпцыі, або эманацыя памяці. Разнастайнасць індывідуальных варыяцый «феномена Пруста» вызначае перспектыўнасць даследавання водараў і пахаў як аб'екта літаратуразнаўчай навукі.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Ароматы и запахи в культуре / сост. О. Б. Вайнштейн. — 2-е изд., испр. — М. : Новое литератур. обозрение, 2010. — Кн. 1. — 616 с.

2. *Костяев, А. И.* Ароматы и запахи в истории культуры: знаки и символы / А. И. Костяев. — Изд. 3-е. — М. : ЛИБРОКОМ, 2012. — 144 с.

3. *Мамцева, В. В.* К вопросу о вербализации концепта «запах» в художественной литературе [Электронный ресурс] / В. В Мамцева. — Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article . — Дата доступа: 18.09.2018.

4. *Фарино, Е.* Запах / Е. Фарино // Введение в литературоведение : учеб. пособие. — СПб. : Изд-во РГПУ им. А. И. Герцена, 2004. — С. 333—342.

5. Эманация [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://поисксłов.рф.Wd . — Дата доступа: 23.10.2018.

УДК 821.161.3:82-343

**А. С. Гушча**

*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## РЫСЫ ЧАРАДЗЕЙНАЙ КАЗКІ Ў ТВОРЫ ПЯТРА ВАСЮЧЭНКІ «ЖЫЛІ-БЫЛІ ПАНЫ КУБЛІЦКІ ДЫ ЗАБЛОЦКІ»

**Уводзіны.** Чарадзейная казка — гэта скарбніца народнай мудрасці, якая ўводзіць чытача ў кола незвычайных падзей. У яе аснове — міфічнае светаўспрыманне, адметная сістэма вобразаў, а ў сюжэце абавязкова прысутнічае чарадзейства, супрацьстаянне незвычайных герояў і ворагаў [1, с. 733]. Казачная фантастыка стварае свой непаўторны свет, у якім, як і ў сапраўдным жыцці, змагаюцца сілы дабра і зла, дзе заўсёды перамагае справядлівасць. Чарадзейныя казкі заснаваны на вымысле аб цудадзейным; у той жа час у такіх казках фантастычнае спалучаецца з рэальным [2, с. 325]. Адным з найбольш цікавых

© Гушча А. С., 2019